Дзяржаўная ўстанова культуры
«Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# "На ўзлёцце дня"

**да 75-годдзя з дня нараджэння В.Коўтун**





*Калі мембранай стала ўся айчына, –*
*Мы з ёй нязменна правяраем слых.*
*Ці ж важна, як жывецца мне, адзінай,*
*Калі жывеш, як за сябе, за ўсіх.*

*(“На самай звонкай ноце…”)*





Валянціна Міхайлаўна Коўтун (па мужу Новік), яна ж Леся Беларуска, Ясельда – паэтка, празаік, драматург, перакладчыца, літаратуразнаўца і грамадскі дзеяч.

Выбітная творчая спадчына Валянціны Коўтун добра вядома чытачам не толькі Беларусі, але і Украіны, Расіі, Літвы, іншых куткоў свету.

У сярэдзіне 60-х яе імя прыгожа ўвайшло ў свет беларускай літаратуры, стала адметным для ўсіх і па-свойму родным для кожнага дзякуючы трапяткой мове, светлай лірыцы, душэўнай глыбіні, багатаму драматызму і неймаверна цікавым, смелым вобразам.



Коўтун Валянціна Міхайлаўна нарадзілася 6 красавіка 1946 г. у вёсцы Дземяхі Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці у сям'і настаўнікаў Міхаіла Фёдаравіча і Ганны Раманаўны Коўтунаў. Сем класаў будучая паэтэса скончыла ў Сушыцкай сярэдняй школе, а пасля пераводу бацькоў на працу ў Жабчыцкую пачатковую школу, вучылася ў бліжэйшай Малоткавіцкай сярэдняй школе, якую скончыла ў 1963 г. 1 верасня таго ж года была накіравана на працу піянерважатай у Паршэвіцкую сярэдняю школу (цяпер Бярозавіцкая), дзе працавала да верасня 1964 г. У верасні 1964 г. стала студэнткай рускага аддзялення філалагічнага факультэта Львоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Івана Франко.

9 красавіка 1968 г., шляхам пераводу з Львоўскага ўніверсітэта, была залічана на 4 курс рускага аддзялення філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверстэта. Там пазнаёмілася з «палескай ластаўкай» Яўгеніяй Янішчыц – так дзяўчаты сталі блізкімі сяброўкамі і слыннымі прадстаўніцамі Палесся літаратурнага. Сваёй Жэні Валянціна Коўтун прысвяціла п'есу «Вясельны хутар».

Пасля заканчэння вучобы (1969) настаўнічала на Гродзеншчыне, працавала літкансультантам "Сельскай газеты", літсупрацоўнікам і рэдактарам аддзела крытыкі і літаратуразнаўства часопіса "Полымя".


ДИПЛОМ
КАНДИДАТА НАУК

Решением

ПРИСУЖДЕНА УЧЕНАЯ СТЕПЕНЬ
КАНДИДАТА
ФИЛОЛОГИЧЕСКИХ НАУК

З 1982 г. – загадчыкам рэдакцыі літаратуры для дзяцей у выдавецтве “Юнацтва”, з 1990 г. – зноў у часопісе “Полымя”, рэдактарам аддзела паэзіі ў часопісе «Маладосць».

Кандыдат філалагічных навук, сябра Саюза пісьменнікаў БССР, СП СССР, СП Украіны, лаўрэат літаратурнай прэміі Аркадзя Куляшова. Старшыня Усебеларускага жаночага фонду святой Еўфрасінні Полацкай (1993-2011).

Завочна скончыла аспірантуру пры БДУ. У інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму: “Паэтычная структура беларускай пазаабрадавай песні пра каханне” (1979).

Пяру Коўтун належаць дзясяткі выданняў: ад зборнікаў паэзіі, раманаў, апавяданняў да літаратуразнаўчых прац. Галоўнай кнігай жыцця пісьменніцы можна назваць раман-дылогію «Крыж міласэрнасці» пра гісторыю жыцця беларускай паэткі, грамадскага дзеяча Цёткі (Алаізы Пашкевіч). Свайму раману аўтар прысвяціла амаль 15 творчых гадоў, па яго матывах ў 90-я гады на экраны выйшаў біяграфічны серыял, зняты кінастудыяй «Беларусьфільм» з Аляксандрам Дамагаравым у галоўнай ролі.

Творчую, навуковую і рэдакцыйную працу В.М.Коўтун сумяшчала з актыўнай грамадскай працай.



У 1993 г. па яе ініцыятыве і пад яе кіраўніцтвам быў створаны Усебеларускі жаночы фонд Еўфрасінні Полацкай. За дванаццацігадовы перыяд дзейнасці Фонду, і найперш неверагоднымі стараннямі В.М.Коўтун, арганізоўвалася асветніцкая праца сярод насельніцтва, праводзіліся міжнародныя кангрэсы, канферэнцыі, творчыя сустрэчы, наладжвалася міжнароднае супрацоўніцтва, на выдатным узроўні тварылася народная дыпламатыя. У гэты перыяд В.М.Коўтун праявіла сябе і як лідар беларускага жаночага руху і яго палымяны публіцыст.

Першыя паэтычныя творы В.М.Коўтун надрукавала ў 1966 г. у львоўскай газеце “Ленінська молодь” у перакладзе на ўкраінскую мову. У гэтым жа годзе яе вершы з’явіліся ў газеце “Літаратура і мастацтва” (“Чорны бусел”, “Золак – лось сахаты…”, “Над вёскаю зялёныя аблокі…” і інш.) і газеце “Чырвоная змена”. Выдала зборнікі вершаў і паэм “Каляровыя вёслы” (1971), “На ўзлёце дня” (1977), “На зломе маланкі” (1981), “Мы робім казку” (1983), “Метраном” (1985), “Вясёлы заасад”(1986), “Лісты да цябе” (1988), “Свяча любові” (2006), “Малітва да Калымы” (2009).



За кнігу “Метраном” паэтэса ў 1986 г. была адзначана Літаратурнай прэміяй Саюза пісьменнікаў Беларусі імя А.Куляшова.

Апошнія гады жыцця В.М.Коўтун працавала над раманам пад рабочай назвай “Над садам Іарданскім”, які так і не быў завершаны.

Трываласць памяці пра пісьменніцу ўгрунтавана яе таленавітымі творамі, тым, што свой творчы лёс звязала з вялікімі дзеячкамі беларускага народа Еўфрасінняй Полацкай і Алаізай Пашкевіч (Цёткай), тым, што сама несла народу асвету і сцвярджала ўпэўненасць у перамозе Дабра.

Выдатная дачка свайго народа, нястомная працаўніца Валянціна Міхайлаўна Коўтун пайшла з жыцця раптоўна 30 красавіка 2011г., адсвяткаваўшы толькі што свой шасцідзесяціпяцігадовы юбілей. Нам пакінула мноства шчырых і светлых твораў і вялікі прыклад працалюбства, волі, самаахвярнасці і бязмежнай любові да Чалавека.


НА 2 АСОБЫ

Прадоўжаны на 197 г.

Подпіс

Прадоўжаны на 197 г.

Подпіс

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПРОПУСК № 272

на наведванне Дома літаратара

тав. Коўтун (Новік) В. М.

Месца працы член СП БССР

Сапраўдны да 31. XII 1978 г.

Першы сакратар Праўлення Саюза пісьменнікаў БССР



Прыхільнікі літаратурнай спадчыны Піншчыны пры падтрымцы мясцовых выканаўчых уладаў выступілі з ініцыятывай усталяваць мемарыяльную дошку ў гонар Валянціны Міхайлаўны Коўтун і Валянціны Іванаўны Локун на Малоткавіцкай сярэдняй школе, дзе пэўны час навучаліся будучыя літаратаркі.

Адкрыццё мемарыяльнай дошкі ў яе гонар будзе важна не толькі для нас, тых, хто памятае. Гэта вельмі важна для сучасных школьнікаў, для будучых пакаленняў, каб ведаць, хто быў да іх, кім яны могуць ганарыцца, чыю справу павінны прадоўжыць і памножыць.






Галоўная тэма зборніка—першае каханне. Героі апавяданняў—людзі маладыя, няўрымслівыя ў выбары жыццёвага шляху і пошукаў высокіх грамадзянскіх ідэалаў. Пісьменніца па-мастацку пераканаўча, рэалістычна перадае «біяграфію» іх пачуццяў: першае захапленне і нечаканае расчараванне, безагляднае імкненне маладога чалавека да шчасця і балючыя апёкі. Адначасова рашаюцца праблемы ўзаемасувязі лёсу з грамадскай этыкай і мараллю.

Творы Валянціны Коўтун добра вядомы чытачам не толькі Беларусі, але Украіны, Літвы, Расіі, іншых краін. Раман «Крыж міласэрнасці» ў еўрапейскай літаратуры — з'ява унікальная. Гісторыка-біяграфічная дылогія створана на аснове жыцця і творчасці славутай паэтэсы, сястры міласэрнасці пачатку стагоддзя Алаізы Пашкевіч (Цёткі). На старонках вострасюжэтнай кнігі ажывае шмат іншых знакамітых людзей пераломнай эпохі — Я. Купала, І.Франко, Э. Ажэшка, К. Каганец, браты Луцкевічы, В.Іваноўскі, дзяржаўныя дзеячы — Мікалай II, граф Вітэ, мітрапаліт Шаптыцкі. Асабліва трапяткой мовай напісаны старонкі пра каханне. У рамане ўспыхвае светлая зорка паэзіі і кахання, гучыць магутны арган эпохі — у храмах Вільні, Львова, Гародні, Кракава, Рыма, Венецыі.










У кнізе тры раздзелы, кожны з якіх — знакавая веха ў творчасці і лёсе паэтэсы. Першы раздзел «Лірыка» склалі паэтычныя творы розных гадоў, другі — «Балады памяці». Пра трэці — «Перастварэнні» — варта сказаць асобна. Ён, у пэўным сэнсе, унікальны. Апроч перакладаў з украінскай мовы (найперш і найбольш з Ліны Кастэнкі), тут друкуюцца перастворания вершы Лесі Беларускі — дзяўчыны з Маладзечна Ларысы Марозавай, якая пісала свае вершы ў сталінскім лагеры на Калыме... Чаму перастворания? Ды таму, што яны не маглі быць запісанымі ў той час, і адноўленыя Валянцінай Коўтун толькі цяпер паводле радкоў, згаданых былым вязьнем Васілём Малагушам, які і данёс памяць пра мужную беларускую патрыётку-паэтку.




Другі зборнік Валянціны Коўтун склалі вершы пра наш час і справы сучаснікаў. Тэматыка паэм — вытокі мужнасці і няскоранасці нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Многія творы напісаны на фальклорнай аснове.




У новай кнізе лірыкі паэтэса закранае гераічнае мінулае нашага народа, яе хвалюе наш сённяшні працоўны дзень, піша яна і пра запаветныя мроі нашага сучасніка. Многія творы В. Коўтун маюць фальклорную аснову. Паэма «На зломе маланкі» прысвечана нашай цудоўнай паэтэсе-рэвалюцыянерцы Элаізе Пашкевіч (Цётцы).

Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Святога Спаса і Найсвяцейшай Ягонай Маці, што ў горадзе Полацку. Б лагаславі, Ойча!




Новая кніга паэткі складзена з дзвюх частак: «Вясенняе прычасце» і «Партрэты». Першая — «Вясенняе прычасце» — прасякнута святлом лірычных пачуццяў, прагай высокіх духоўных і ідэалаў. «Партрэты» — гэта вострасюжэтная галерэя лёсаў і характараў вядомых паэтаў і вучоных. Вершы і паэмы пра Пушкіна, Байрана, вучонага-археолага Эванса, Апалінэра, Купалу, Цётку напісаны метафарычна і вобразна, з праекцыяй на сучаснасць.






Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова паэтэса Валянціна Коўтун уключыла ў гэтую кнігу лепшыя вершы і паэмы з раней выдадзеных кніг. Яе лірыка, пранізаная святлом высокіх духоўных парыванняў, звернутая да самых тонкіх інтымных пачуццяў, прыцягвае ўвагу чытачоў сваім імкненнем асэнсаваць незвычайныя драматычныя лёсы выдатных паэтаў-бунтароў розных эпох: Байрана, Цёткі, Купалы. Праз багатую сімволіку і метафарычнасць паэтэсе ўдаецца накіраваць чытацкую ўвагу да вострых праблем сучаснасці.




Гэты зборнік—апошні, які склала пры жыцці выдатная беларуская паэтка і грамадская дзеячка Валянціна Коўтун. У яго ўвайшлі лепшыя творы Валянціны Міхайлаўны, у тым ліку вядомая нізка вершаў «Малітва да Калымы», напісаных ад імя Лесі Беларускі—увасаблення подзвігу беларускіх жанчын, паэмы, лібрэта оперы, прысвечанай святой Ефрасінні Полацкай. Зборнік будзе годным падарункам усім аматарам беларускай літаратуры і помнікам ягонай аўтарцы.





*Пінская цэнтральная раённая бібліятэка*
*імя Яўгеніі Янішчыц*
225710
*г. Пінск, вул. ІПД, 35*
*тэл. 8 (0165) 32 23 66*
e-mail: crbpinsk@tut.by